Сацыяльнай базай пратэсных акцый станавілася вучнёўская моладзь. Звесткі з крыніц даюць магчымасць казаць, што да распаўсюджвання агітацыйных матэрыялаў на тэрыторыі беларускіх губерняў мелі дачыненне прадстаўнікі польскіх паўстанцкіх структур.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Балахоўцы: сведчанні. Дакументы. Даследаванні / [пераклад, прадмова, каментарыі А. Вашкевіча, А. Чарнякевіча, Ю. Юркевіча]. 2-е выд., дапоўненае і перапрацаванае. Смаленск: Інбелкульт, 2014.

2. Миловидов, А. И. Участие молодёжи северо-западного края в мятеже 1863 года и вызванная им реформа местных учебных заведений. Вильно, 1904.

3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1430.

4. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг.: материалы и документы / В. Дьяков [и др.]; под общ. ред. В. Дьякова. М.: Наука, 1964.

5. Фірыновіч, А. Э. Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў. Мінск : Беларус. навука, 2013.

6. Фірыновіч, А. Э. Выяўленчыя матэрыялы па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі //Актуальные проблемы источниковедения : материалы междунар. науч.-практ. конф. к 135-летию со дня рождения В. И. Пичеты, Минск-Витебск, 9–11 октября 2013 г. Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. С. 185–188.



**УДК 94(476)|654|**


# УСПАМІНЫ МЕЧЫСЛАВА ПАРОЎСКАГА ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПАЧАТКУ XX ст.


***В.С. Макарэвіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, makarevich.bsu.79@gmail.com*



У артыкуле разглядаецца змест успамінаў аднаго з вартых увагі ўдзельнікаў грамадска-палітычнага жыцця Беларусі пачатку XX стагоддзя, супрацоўніка Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, польскага таварыства “Асвята” – Мечыслава Пароўскага. Адлюстраваны змест асноўных сюжэтных ліній, дадзена характарыстыка крыніцы.



***Ключавыя словы:*** *мемуарыстыка; успаміны; гістарычныя крыніцы; М. Пароўскі; гісторыя Беларусі.*

# ВОСПОМИНАНИЯ МЕЧИСЛАВА ПОРОВСКОГО КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ НАЧАЛА XX в.

***В.С. Макаревич***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, makarevich.bsu.79@gmail.com*

В статье рассматривается содержание воспоминаний одного из примечательных деятелей общественно-политической жизни Беларуси начала XX века, сотрудника Минского общества сельского хозяйства, польского общества “Освята” – Мечислава Поровского. Отражено содержание основных сюжетных линий, дана характеристика источника.

***Ключевые слова:*** *мемуаристика; воспоминания; исторические источники; М. Поровский; история Беларуси.*

# MIECZYSLAW POROVSKY'S MEMOIRS AS A SOURCE OF THE HISTORY OF BELARUS AT THE EARLY XXth CENTURY

***V. Makarevich***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, 4, 220030, Minsk, Belarus, makarevich.bsu.79@gmail.com*

The article examines the content of Mieczyslaw Porowski’s memoirs – one of the prominent figures of the socio-political life of Belarus at the beginning of the XX century, an employee of the Minsk Society of Agriculture and the Polish society “Oswiata”. The content of the main storylines is reflected, the characteristics of the source are given.

***Keywords:*** *memoirs; historical sources; M. Porowski; The history of Belarus.*

Мемуарыстыка складае асноўную частку вялікага тыпу гістарычных крыніц, за якімі ў апошнія дзесяцігоддзі замацаваўся тэрмін *эгадакументы*. Нягледзячы на відавочную суб’ектыўнасць, мемуарыстыка з’яўляецца надзвычай важнай, на яе часта спасылаюцца. Адначасова яна таксама і папулярны жанр літаратуры. Для Беларусі асаблівасцямі мемуарыстыкі XIX – пачатку XX ст. з’яўляецца яе шматмоўнасць, раскіданасць па розных месцах захоўвання, сацыяльная прыналежнасць аўтараў пераважна да прывелеяваных саслоўяў. Гэтыя акалічнасці накладаюць значны адбітак на спецыфіку выкарыстання мемуарыстыкі ў даследчай працы гісторыкаў. Мова мемуараў, у якіх ідзе гаворка пра падзеі, якія мелі месца на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пач. XX ст., гэта звычайна польская, руская, беларуская, ідыш, і нават і

некаторыя заходнееўрапейскія мовы. Мемуарыстыка Беларусі XIX – пач. XX ст. паводле знаходжання арыгіналаў тэкстаў раскідана ў асноўным па чатырох краінах – Беларусь, Расія, Польшча, Літва. Нямала матэрыялаў захоўваецца і ў бібліятэках і архівах краін Заходняй Еўропы, ЗША. На сёння некаторыя матэрыялы алічбаваныя і даступны для шырокага кола чытачоў on-line.

Да гэтага часу ніякага комплекснага даследавання мемуарыстыкі Беларусі перыяду Расійскай імперыі не праводзілася, за выключэннем больш агульных прац па бібліяграфіі А. Сакольчыка і М. Крэканэ, у якіх сярод іншага прадстаўлена і дарэвалюцыйная мемуарыстыка [1; 2]. Не было таксама рэалізавана праграм па зборы і апрацоўцы мемуарыстыкі Беларусі, як напрыклад гэта было зроблена архівам-бібліятэкай імя Асалінскіх у польскім Вроцлаве. Яшчэ ў пасляваенны перыяд, у час існавання Польскай народнай рэспублікі, супрацоўнікамі гэтай установы быў рэалізаваны вялікі праект па зборы і выданні мемуараў, вынікам чаго стала як падрыхтоўка (тут маецца на ўвазе непасрэднае іх напісанне) цэлага комплексу мемуараў на замову гэтай установы, так і іх выданне. Таксама заслугоўвае ўвагу падрыхтаваная супрацоўнікамі гэтай установы шматтомная серыя даведачнага характару прысвечаная мемуарыстыцы – інвентар рукапісаў, які працягвае выдавацца па меры папаўнення рукапісных збораў бібліятэкі [3]. Безумоўна, вельмі дапамагае беларускім даследчыкам у выяўленні мемуарных крыніц калектыўнае даследаванне, праведзенае яшчэ савецкімі спецыялістамі пад кіраўніцтвам прафесара П.А. Заянчкоўскага, якое налічвае 13 кніг – “История дореволюционной России в дневниках и воспоминаниях” [4]. Выданне носіць даведачна-інфармацыйны характар. Выклікае ціквасць і адзін з апошніх праектаў па зборы польскамоўнай мемуарыстыкі рэалізаваны польскімі даследчыкамі экадакументальнай спадчыны на сродкі польскай нацыянальнай праграмы развіцця гуманістыкі, які знайшоў сваю рэалізацыю ў трохтомным выданні “Успаміны і лісты польскіх аўтараў з забраных зямель (Літва, Беларусь, Украіна) у 1795-1918 гг.” [5] Тут немагчыма не звярнуць увагу на кантраверсійнасць фармулёвак, якія выкарыстоўваюцца ў назве ў адносінах да этнічных тэрыторый Беларусі, Літвы і Польшчы.

Як бы там не было, але сярод матэрыялаў мемуарыстыкі па гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. польскамоўныя ўспаміны складаюць ці не асноўную частку. Такая іх колькасць тлумачыцца яшчэ адной спецыфікай

гэтага тыпу крыніц па гісторыі Беларусі – тым, што гэта пераважна ўспаміны дваран ці людзей, якія атрымалі вышэйшую адукацыю, ці былі актыўныя ў грамадска-палітычным жыцці і належалі да больш высокай саслоўнай ці сацыяльнай праслойкі грамадства. Зрэдку гэта ўспаміны мяшчан, і толькі ў пачатку XX ст. паяўляюцца ўспаміны сялян. Да сярэдзіны XIX ст. польская мова фактычна выконвала функцыю адзінай літаратурнай мовы для мясцовай інтэлігенцыі, што было вынікам працяглага існавання традыцый былой Рэчы Паспалітай і сфармаванага ёй культурнага і ментальнага падмурку. Разам з тым, нямала было ўжо і ўспамінаў напісаных на рускай мове, пераважна чыноўнікамі якія траплялі ў Беларусь на службу. З другой паловы XIX ст. колькасць мемуараў напісаных на рускай мова павялічваецца. Нярэдка на ёй ужо пачынаюць пісаць успаміны і мясцовыя ўраджэнцы.

Успаміны Мечылава Пароўскага (1878–1965) адносяцца да пачатку XX ст. Арыгінал успамінаў захоўваецца ў Вроцлаве ў бібліятэцы Асалінскіх (Ossolineum) [6], а ў Варшаве ў Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы можна таксама азнаёміцца з іх тэкстам праз выкарыстанне мікрафільма [7]. Мечыслаў Пароўскі быў карэнным палякам, нарадзіўся ў 1878 г. у Варшаве. У 1904-м скончыў універсітэт. Адразу пасля яго заканчэня атрымаў месца працы ў Мінскім сельскагаспадарчым таварыстве (сіндыкаце – як ён сам пісаў). Той факт, што ўспаміны Пароўскага – гэта ўспаміны паляка, які паходзіў з па-за меж Беларусі, вельмі важны, паколькі гэта позірк звонку на Беларусь, і мы маем даволі падрабязныя ўспаміны напісаныя чалавекам, які быў знешнім і ўнутраным назіральнікам. Апынуўшыся ў Мінску, М. Пароўскі актыўна ўключыўся не толькі ў працу, у гаспадарчае жыццё, але таксама і ў грамадска-палітычныя працэсы. У 1908 г. ён становіцца сузаснавальнікам польскага таварыства “Oswiata” у Мінску, а ў 1917 г. – старшынёй польскай школьнай арганізацыі Міншчыны “Polska macierz szkolna ziemi mińskiej”. У 1918 г. у час бурлівых падзей вельмі сваечасова вярнуўся ў Польшчу.

Ва ўспамінах М. Пароўскага знайшлі сваё адлюстраванне разнастайныя падзеі грамадскага і гаспадарчага жыцця на тэрыторыі пераважна Мінска і Міншчыны. М. Пароўскі яўна выказваў свае сімпатыі не толькі польскай школьнай справе, але і беларускаму руху, што абумовіла паяўленне ў яго ўспамінах крытыкі нацыянальнай палітыкі Пілсудскага, знайшлі адбітак асаблівасці ўзаемаадносін паміж

прыехаўшымі ў Беларусь палякамі (караняжамі – М. Пароўскі) і мясцовай інтэлігенцыяй (літвінамі). Аўтар даволі падрабязна спыняецца на стварэнні і дзейнасці Мінскага сельскагаспадарчага таварыства, узгадвае правядзенні яго пасяджэнняў, адносіны ўнутры таварыства, а таксама паміж прыезжымі рускімі і мясцовымі памешчыкамі, нефармальныя кантакты, сустрэчы ў доме Ядвігі Кастравіцкай, успамінае таксама аб функцыянаванні гандлёвага аддзела таварыства, пра актыўную выставачную і папулярызатарскую дзейнасць таварыства. Так, вельмі падрабязна ён апісвае арганізацыю і правядзенне сельскагаспадарчай выствы ў Слуцку ў 1908 г., а разам таксама змяшчае свае ўспаміны пра Слуцк. Аўтар асабіста быў знаёмы з вядомымі ў Мінску на той час людзьмі, узгадвае пра іх. Гэта і Э.Вайніловіч, і А. Смоліч і інш. Асобную ўвагу звяртае таксама на трохі больш позні час – на дзейнасць камітэта па ўшанаванні памяці Э. Вайніловіча і выданні яго мемуараў.

Ёсць сярод успамінаў М. Пароўскага і заслугоўваючыя ўвагу даследчыка апісанні ладу жыцця насельніцтва, у прыватнасці дробнай шляхты, яе ментальнасці, мовы, самасвядомасці. Характэрызуе аўтар і ўзаемаадносіны паміж памешчыкамі і сялянствам, адзначае змены ў гэтых адносінах, якія адбыліся ў 1918–1920 гг. Характэрызуючы мясцовых памешчыкаў, для  якіх мовай міжасабовых абносін была польская, ён адначасова адзначае, што яны не вельмі добра валодалі рускай мовай, але затое добра гаварылі па-беларуску. Ёсць ва ўспамінах асобныя апісанні насельніцтва тагачаснага Мінска – беларусаў, яўрэяў, палякаў, татар. Даеца і агульная характарыстыка Мінскай губерні. Сярод агульнай нарацыі ў мемуарах уважлівы чытач і даследчык можа вылавіць характарыстыку ўзаемаадносін паміж мясцовымі памешчыкамі і ўладай, асаблівасці сітуацыі ў Мінску напярэдадні і ў пачатку Першай сусветнай вайны, ўзгадкі пра дзейнасць нямецкага шпіёна Швептэнэра, апісанні асобных маёнткаў, крытыку ўспамінаў Ваньковіча “Шчанячыя гады (Szczenięce lata)”.

Дае аўтар і агульную характарыстыку беларускаму руху таго перыяда і яго дзеячаў, з якімі яму асабіста давялося сустракацца і супрацоўнічаць: А. Смоліча, Л. Дубейкаўскага, П. Аляксюка, апавядае пра арганізацыю таемнага польскага навучання і функцыянаванне польскіх адукацыйных арганізацый. Асобна аўтар закранае пытанне функцыянаванне касцёла і спробы яго беларусізацыі ў гады Першай сусветнай вайны. Узгадвае пра дзейнасць Зыгмунта Лазінскага і ксяндза

Ф. Абрантовіча і іншых святароў. Узгадвае Пароўскі таксама пра ксяндза В. Гадлеўскага і тую дапамогу, якую яму аказала Магдалена Радзівіл, і як пачалося ўвядзенне беларускай мовы ў дадатковае набажэнства і ў навучанне ў каталіцкай семінарыі.

Такім чынам, успаміны Мечыслава Пароўскага даволі багатыя на сюжэты жыцця Міншчыны першых двух дзесяцігоддзяў XX ст. Варта звярнуць ўвагу, што гэтыя ўспаміны слаба выкарыстоўваліся беларускімі даследчыкамі і, з нашага пункту гледжання, могуць служыць важнай крыніцай для верыфікацыі звестак, а таксама самастойнай крыніцай інфармацыі пра грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае жыццё Беларусі пачатку XX ст. пры ўмове належнага крытычнага падыходу да іх выкарыстання.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии (1768–1917 гг.): библиографический указатель / А.А. Сакольчик. Изд. 2-е, дополненное и переработанное. Минск., 1976.
2. Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм / М.Г. Крэканэ, А.А. Сакольчык. Мінск, 1969.
3. Inwentarz rękopisów Biblioteki Zakładu Narodowego im. Ossolińskich we Wrocławiu. T. I–XX. Wrocław, 1948–2016.
4. История дореволюционной России в дневниках и воспоминаниях: Аннотир. указ. книг и публ. в журн. / Науч. рук., ред. и введение П.А. Зайончковского. Т.1–5. М.: Книга, 1976–1989.
5. Pamiętniki i listy polskich autorów z Ziem Zabranych (Litwa, Białoruś, Ukraina) w latach 1795–1918. T. 1-III, opr. M. Domańska-Nogajczyk, T. Wojcik. Kielce, 2017.
6. Porowski, M. Wspomnienia 1904–1918. // Zakład Narodowy im. Ossolińskich we Wrocławiu. Sygn 13542/II.
7. Porowski, M. Wspomnienia 1904–1918 // Biblioteka Narodowa. MF BN.


**УДК 94(476)+316.44+323.3**

# МАДЭРНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX стст. (ПОБЫТ І ПАЎСЯДЗЁННАСЦЬ)

*Г.І. Маскевіч*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, maskevich@bsu.by*

Разглядаюцца асобныя аспекты развіцця мадэрнізацыйных працэсаў у сялянскім асяроддзі Беларусі на рубяжы XIX–XX стст. Звяртаецца ўвага на